билет на представление можно в кассах цирка и онлайн-сервисах. Цены стартуют от 6 рублей.
232 33-77-86 и на сайте цирка gomel-circus.by. Ледовое королевство ждет вас и ваших детей до 20 октября.

**ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА**

# Гомель мой, душы маёй сталіца

**У спецыялізаваным аддзеле 5-га філіяла цэнтралізаванай гарадской бібліятэчнай сістэмы, на базе аддзела рэабілітацыі ўнітарнага прадпрыемства "Светатэхніка", адбылася творчая літаратурна-музычная сустрэча.**

Эпіграфам стаў радок Канстанціна Цітова "Гомель мой — душы маёй сталіца". У імпрэзе бралі ўдзел члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Галіна Рагавая і Дар'я Дарошка, якія расказалі пра міжнародны фестываль "Славянскія літаратурныя дажынкі", прачыталі свае вершы пра Гомель, восень і каханне.

На агеньчык завіталі творцы з Рэчыцы: аўтары-выканаўцы Сцяпан Андрэеў і Аляксей Бязрукаў, Мікалай Арбузаў і Святлана Каленчукова. Святлана падзялілася ўражаннямі пра падзеі фестывалю "Алёхінскія чытанні", які праводзіцца ў Курску кожныя два гады. Сёлета Мікалай стаў лаўрэатам у намінацыі "Паэзія", а Святлана атрымала дыплом за першае месца ў намінацыі "Мастацкае чытанне".

Пакуль гучалі песні, госці імпрэзы частаваліся гарбатай.

Сустрэчу аздобілі песнямі, вершамі і байкамі. Мікрафон пераходзіў з рук у рукі, і за ўвесь час абышоў усю залу тройчы.

Натхняючую атмасферу, як заўжды, стварыла гаспадыня імпрэзы, бібліятэкар Людміла Шарамет, дзякуючы якой усе прысутныя пачувалі сябе нібы ва ўтульнай кавярні сярод блізкіх сяброў.

**В. УЛАДЗІМІРАЎ**